**Свечнікава А.У.,**
студэнтка, гр. 115

# ЭФЕКТЫ І КАНТРАСТЫ Ў ЛІТАРАТУРНЫМ ТВОРЫ

Эфекты — асаблівасці твора, на якіх канцэнтруецца ўвага чытача. Кантрасты — спалучэнне процілегласцей. Эфекты і кантрасты падзяляюцца на колькасныя і сэнсавыя.

*Колькасныя эфекты.* Скарачаецца аб'ём верша да дыстыха і монаверша. Выкарыстоўваецца спалучэнне павялічаных радкоў з радкамі, скарочанымі да мінімуму. Існуе ліпалогас ("адмаўленне ад слова") — творы, напісаныя без пэўных часцін мовы. Ідзе скарачэнне слова (яго рассячэнне), у тым ліку да таго, што паэт аперыруе толькі асобнымі літарамі. Апофеоз скарачэння — адсутнасць літар наогул (прыклад — верш Я. Сно).

*Сэнсавыя эфекты.*

1. Існуюць дыяды процілегласцей — паняццяў, якія выклікаюць адмоўныя і станоўчыя эмоцыі.

2. Эфект "вытрымкі". Асобныя творы з цягам часу выклікаюць пачуцці, дыяметральна процілеглыя тым, якія выклікалі раней: змяняюцца эпоха, ідэалогія і паняцце маральнасці. Часам маральнае ў мінулым амаральнае ў сучаснасці.

3. Музычныя эфекты:

а) гукаперайманне;

б) эфект рэха (рэверс);

в) стэрэаэфект: дзве галасавыя лініі, якія ідуць паралельна.

4. Узаемапранікненне:

а) проза і паэзія (паэзія змяшчае празаічныя ўкрапіны, верш робіцца верлібрам, проза таксама ідзе да нейкага прамежкавага паміж прозай і паэзіяй стану);

б) трагічнае змяшчае элементы камічнага;

в) літаратурная крытыка змяшчае пародыю;

Репозиторий БГУКИ

г) стылізацыя (літаратурныя і моўныя штампы, адноўленыя ў літаратуры, марлінізмы, суконная мова, канцылярыт, савецка-партыйная мова).

5. "Невядомая мова" (парушэнне звыклай канструкцыі сказа і падпарадкавальнай сувязі паміж словамі, словатворчасць, мудрагельства, калі хаос паглынае гармонію, слова без сэнсу).

6. Катарсізм: новы літаратурны кірунак.

Першы маніфест катарсізму быў апублікаваны ў Полацку ў 1989 годзе. Заснавальнік-тэарэтык — А.М.Раткевіч, старшыня Беларускага літаратурнага саюза "Полоцкая ветвь". Катарсізм — ад паняцця "катарсіс" ("ачышчэнне"), уведзенага Арыстоцелем. Ачышчэнне-прасвятленне рэцыпіента з'яўляецца асноўным крытэрыем таленавітасці твора.

Уводзіцца паняцце "преобраз" (аўтарства А.М. Раткевіча). "Преобраз" — вобраз, які ўздзейнічае на маральнасць, пераўтварае бачную і нябачную рэальнасць, ажыццяўляючы катарсіс. Катарсізм — рух да жыццесцвярджальных пафасу (характару твора) і этасу (духу твора) шляхам трагедызацыі, міфалагізацыі, філасафізацыі твора і эмпатызацыі душы (эмпатыя — здольнасць да суперажывання), а таксама словатворчасці.

Вытрымкі з маніфеста катарсізму:

1. Моц паэтаў не ў іх падабенстве, а ў арыгінальнасці.
2. Бунт дзеля абнаўлення.
3. Форма мусіць быць правільнай і пластычнай.
4. Змест — пранізлівым і карысным (карыснасць — у здольнасці даваць эстэтычнае задавальненне).

Такім чынам, катарсізм абагульняе пошукі паэтаў XX ст. — футурыстаў, сімвалістаў, акмеістаў.

Рэпазіторый БДУКіМ